*УДК 316.77:372.881.1:372.882*

# КАФЕДРА – АЎТАР – ЧАСОПІС
# У КАНТЭКСЦЕ АДУКАЦЫЙНЫХ СТРАТЭГІЙ І ІНАВАЦЫЙ

**А. І. Бельскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, alesbelsky@yandex.by*

У артыкуле асэнсоўваецца роля профільнай кафедры ў арганізацыі навуковых даследаванняў і трансляцыі перадавога метадычнага вопыту праз каналы педагагічнай перыёдыкі. Паказваецца значэнне публікатарскай дзейнасці вядучых вучоных-педагогаў і настаўнікаў-практыкаў на развіццё беларускай дыдактыкі і адукацыйнай практыкі. За аснову ўзяты зместавы матэрыял спецыялізаваных навукова-метадычных выданняў «Беларуская мова і літаратура» і «Філалагічная адукацыя».

***Ключавыя словы***: кафедра; навукова-метадычны часопіс; В. У. Протчанка; тэорыя і практыка; моўная і літаратурная адукацыя; інавацыі; артыкул; метадычная публікацыя; педагагічная дзейнасць.

# DEPARTMENT – AUTHOR – JOURNAL
# IN THE CONTEXT OF EDUCATIONAL STRATEGIES AND INNOVATIONS

**A. I. Belski**

*Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, alesbelsky@yandex.by*

The article conceptualizes the role of a field-specific department in the organization of scientific research and the transfer of advanced methodological experience through the channels of pedagogical periodicals. The importance of the publishing activities of leading scholars, teachers and practitioners on the development of Belarusian didactics and educational practice is indicated. The paper is based on the informative material of specialized scientific and methodological publications «Belarusian Language and Literature» and «Philological Education».

***Key words:*** department; scientific and methodological journal; V. U. Protchanka; theory and practice; language and literary education; innovations; article; methodical publication; pedagogical activity.

Роля ўніверсітэцкай кафедры ў арганізацыі вучэбнага працэсу, прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў заўсёды была асноўнай, вядучай, але ніколі не абмяжоўвалася выключна гэтым. Ад самага пачатку

стварэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1921) вучоныя і педагогі педагагічнага факультэта непасрэдна ўдзельнічалі ў станаўленні і развіцці нацыянальнай асветы, стварэнні тагачаснай адукацыйнай сістэмы, вырашаючы важныя надзённыя і перспектыўныя задачы, закладваючы навукова-тэарэтычныя і практыка арыентаваныя прынцыпы дзейнасці навучальных устаноў. Вучоныя, працуючы на ўніверсітэцкіх кафедрах беларускай мовы, беларускай літаратуры і этналогіі, чытаючы адпаведныя курсы, запачаткоўвалі і рухалі на новым этапе метадычную думку і прэзентавалі эфектыўныя метадалагічныя падыходы, інавацыйныя і перадавыя канцэпцыі, значэнне якіх мела вялікі, асноватворны ўплыў на далейшае развіццё беларускай дыдактыкі і адукацыйнай практыкі. Выдатны педагог-выкладчык Якуб Колас (К. М. Міцкевіч) грунтоўна распрацаваў методыку навучання роднай мове [1], прафесар І. І. Замоцін, прытрымліваючыся прагрэсіўных педагагічных ідэй і поглядаў, сфармуляваў асноўныя дыдактычныя прынцыпы літаратурнай адукацыі [2; 3]. Працы гэтых аўтараў сталі ініцыяльнымі, фундаментальна-эталоннымі, значнымі інтэлектуальна-творчымі здзяйсненнямі XX стагоддзя ў галіне метадычнай навукі.

У тагачасных умовах змен, пераўтварэнняў, накіраваных на актывізацыю даследчай дзейнасці і асветніцкай справы, адбывалася і станаўленне педагагічнага друку, закліканага стаць адукацыйнай платформай для прэзентацыі новых прафесійных ведаў, прапаганды перадавых ідэй і вопыту, прафесійнага самаразвіцця і самаўдасканалення, арганізацыі вучэбнага працэсу і інш. У 1924 г. пачаў выдавацца часопіс «Асвета», на старонках якога змяшчалі свае артыкулы выкладчыкі БДУ Якуб Колас (К. М. Міцкевіч), І. І. Замоцін, М. М. Піятуховіч і інш. Пазней, у першай палове 1940-х гг., выходзілі такія адукацыйныя выданні, як педагагічны часопіс «Савецкая школа» (у 1960-м перайменаваны ў «Народную асвету») і метадычны часопіс «У дапамогу настаўніку», якія шырока распаўсюджваліся па ўсёй Беларусі. Наяўнасць гэтых выданняў і публікаванне ў іх артыкулаў аўтарытэтных, высокапрафесійных аўтараў засведчылі, што ў той час прадуктыўна вяліся педагагічныя і метадычныя даследаванні па актуальных пытаннях навучання і школьнай адукацыйнай практыкі.

На новым гісторыка-культурным этапе, у канцы 1980-х – на пачатку 1990-х гг., калі ў выніку паўстала суверэнная, незалежная краіна Беларусь (1991), узнікла патрэба ў стварэнні нарматыўных дакументаў у сферы нацыянальнай адукацыі (канцэпцый, стандартаў, планаў, вучэбных праграм), распрацоўцы яе тэарэтычных і навукова-метадычных асноў, падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў новага пакалення. Час адкрыў якасна іншыя магчымасці і перспектывы. У працэс рэфарма-

вання школы ўключыліся вучоныя філалагічнага факультэта БДУ, дзейнасць якіх у рамках супрацоўніцтва з БелНДІ адукацыі, а з 1993 г. (пасля перайменавання) з Нацыянальным інстытутам адукацыі была накіравана на пошук новых падыходаў, ідэй і іх практычную рэалізацыю. Адбывалася інтэнсіўнае станаўленне і развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі, што ў сваю чаргу актуалізавала распрацоўку арыгінальных структурназмястоўных мадэляў, эксперыментальную апрабацыю праграмна-метадычнага забеспячэння, укараненне педагагічных тэхналогій і інш. У канцы XX ст. выразна акрэсліліся новыя тэндэнцыі ў тэорыі і методыцы моўнага і літаратурнага навучання. У авангардзе адукацыйных стратэгій і інавацый, сэнсатворчых пошукаў педагагічнай навукі на той час былі акадэмік М. А. Лазарук (1926–2000) і прафесар В. У. Протчанка (1930–2002). Яркія творчыя асобы, знакавыя постаці, самыя аўтарытэтныя і знакамітыя вучоныя Нацыянальнага інстытута адукацыі. Яны, выдатныя тэарэтыкі і аналітыкі, адыгралі выключную ролю на першапачатковым этапе фарміравання сучаснай адукацыйнай парадыгмы, сталі генератарамі новых навуковых ідэй і падыходаў, стваральнікамі канцэпцый і праграм, яны, дбаючы пра сістэмныя змены, абнаўленне зместу і якасць адукацыі, працавалі надзвычай актыўна і самаааддана на вынік і перспектыву. Прыжыццёвыя выданні М. А. Лазарука «Навучанне і выхаванне творчасцю» (1994) [4] і В. У. Протчанкі «Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове» (2001) [5] – педагагічныя кнігі-тастаменты, якія змяшчаюць навукова-педагагічныя і метадычныя працы, напісаныя кожным з вучоных на сваім апошнім, заключным этапе творчасці. На сёння па сутнасці гэтыя кнігі з'яўляюцца жывой і запатрабаванай класічнай спадчынай, асноватворнымі крыніцамі і навуковымі арыенцірамі на шляху далейшага развіцця беларускай дыдактыкі і методыкі. Зазначым: шэраг іхніх навуковых напрацовак у выглядзе артыкулаў займелі апрабацыю на старонках беларускай перыёдыкі.

Прафесар В. У. Протчанка выдатна разумеў патрэбу ў зваротнай сувязі з педагагічнай грамадскасцю, неабходнасць аператыўнай, своечасовай трансляцыі найноўшай навуковай і адукацыйнай інфармацыі, стымуляванне матывацыйна-практычнай дзейнасці настаўніцтва праз актуалізацыю надзённых задач, каштоўнасных установак і сэнсаў, стратэгічных інавацый. У 1995 годзе ён стаў на чале часопіса «Беларуская мова і літаратура» – новага навукова-метадычнага часопіса для настаўнікаў краіны, які пачаў выдавацца ў серыі «У дапамогу педагогу», заснаванай з ініцыятывы доктара педагагічных навук, прафесара У. П. Пархоменкі (1940–2017). І як старэйшы вучоны, і як галоўны рэдактар В. У. Протчанка цудоўна ўсведамляў неабходнасць якаснай прафесійнай падрыхтоўкі новага пакалення настаўнікаў і метадыстаў, спе-

цыялістаў у галінах лінгвадыдактыкі і літаратурнага навучання, разумеў важнасць падтрымкі маладых аўтараў у публікатарскай дзейнасці і на шляху творчага самасцвярджэння, набыцця адпаведнай статуснай кваліфікацыі [6]. З пачатку 1990-х гг. В. У. Протчанка адначасова пачаў выкладаць на філфаку БДУ, ён доўгі час займаў пасады прафесара кафедры методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры, потым – кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры [7, с. 90]. Запрасіла яго ва ўніверсітэт дацэнт З. Б. Варановіч (1932–2009), загадчыца кафедры методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры (узначальвала кафедральны калектыў з 1990 па 1997 г.). І. М. Саматыя так засведчыла прыход на працу ў БДУ таленавітага вучонага і педагога: «На кафедру па запрашэнні загадчыцы прыходзіць вядучы ў краіне спецыяліст па методыцы выкладання мовы доктар педагагічных навук Васіль Ульянавіч Протчанка, які чытае спецкурс па методыцы выкладання сінтаксісу і вядзе спецсемінар. Пад уплывам асобасна арыентаванага падыходу, які распрацоўваўся В. У. Протчанкам у дачыненні да методыкі мовы, на кафедры чытаюцца ўсе асноўныя курсы, запрашаюцца для чытання спецыяльных курсаў па асобасна арыентаваным навучанні выкладчыкі-педагогі з іншых устаноў, творчыя настаўнікі-практыкі» [8, с. 55].

Грунтоўныя тэарэтыка-метадалагічныя і метадычныя артыкулы самога галоўнага рэдактара выявілі філасофска-аналітычны погляд на пытанні моўнай адукацыі, фарміравання светапогляду і культуры асобы, яны яскрава засведчылі, што часопіс «Беларуская мова і літаратура» ствараецца як паўнавартасны інтэлектуальны творчы прадукт, высокапрафесійнае выданне, у якім павінны быць зацікаўлены чытачы і падпісчыкі. Сваімі публікацыямі В. У. Протчанка ўздымаў навучанне мове на новы ўзровень, адзначаючы неабходнасць інтэнсіўнага развіцця маўлення, практычнага авалодання родным словам. Мову ён разглядаў як сродак самаразвіцця і самавыяўлення асобы, фарміравання яе духоўнага свету. Вучоны-педагог пісаў: «У цэнтры ўвагі заўсёды павінна быць моўная культура, якую мы разумеем шырока, а не толькі як валоданне арфаэпічнымі, арфаграфічнымі, граматычнымі нормамі. Тут маецца на ўвазе і комплекс праблем, звязаных з этыкай маўлення, з камунікатыўным ядром асобы, з духоўнасцю маладых людзей. <…> Духоўнасць асобы з’яўляецца галоўнай крыніцай яе жыццёвай сілы, энергіі… І няма іншай педагагічнай велічыні, якую можна было б па значнасці параўнаць з той роляй, якую выконвае ў гэтым працэсе роднае слова» [9, с. 8]. За час свайго рэдактарства (1995–2001) В. У. Протчанка пастаянна выступаў на старонках часопіса з прафесійнай аналітыкай і артыкуламі дыдактычна-метадычнага характару, назавём некаторыя з іх: «Крыніца ду-

хоўнасці і дыдактычны сродак» (1996, № 2), «Жывое слова ў методыцы навучання роднай мове» (1998, № 1), «Арфаграфія – важны кампанент у сістэме работы па развіцці мовы» (1998, № 4), «Урокі беларускай мовы ў IX класе» (2000, № 4) і інш.

Прафесар В. У. Протчанка ад самага пачатку стварэння часопіса «Беларуская мова і літаратура» далучыў да ўзаемакарыснага і плённага супрацоўніцтва калег з кафедры методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры і – шырэй – выкладчыкаў філалагічнага факультэта. Нароўні з першымі публікацыямі Васіля Ульянавіча на часопісных старонках з'явіліся артыкулы І. М. Саматыя «"Методыка роднай мовы" К. Міцкевіча, В. Тэпіна» (1995, № 1), І. Э. Саўко, У. П. Саўко «Паняцце пра "тэкст" пры вывучэнні беларускай мовы» (1996, № 4) і некаторыя іншыя.

Часопіс «Беларуская мова і літаратура» дзякуючы намаганням галоўнага рэдактара В. У. Протчанкі рабіўся школай перадавой навукова-метадычнай думкі. Тут хацелася б нагадаць, што пачынаючы з 1988 г. ужо выходзіў часопіс «Беларуская мова і літаратура ў школе», які ў 1992 г. быў перайменаваны ў «Роднае слова». Пад такой назвай ён і вядомы сёння шырокаму чытачу. Часопіс «Беларуская мова і літаратура» як новае і перспектыўнае выданне быў закліканы выканаць сваю місію ці ролю ў інфармацыйна-метадычнай падтрымцы педагогаў, забеспячэнні дзейнасці ўстаноў адукацыі і заняць уласную нішу сярод педагагічнай перыёдыкі («Народная асвета», «Адукацыя і выхаванне», «Роднае слова» і інш.). Менавіта першым галоўным рэдактарам В. У. Протчанкам была распрацавана канцэпцыя часопіса як практыка арыентаванага выдання, г. зн. скіраванага на дзейсную метадычную дапамогу настаўнікам у арганізацыі вучэбнай і выхаваўчай працы, у прафесійным развіцці і самаўдасканаленні, закліканага даць шырокую магчымасць для прэзентацыі і пашырэння перадавога, найбольш эфектыўнага педагагічнага вопыту. Рэдакцыйная стратэгія палягала ў аб'яднанні творчых сіл і намаганняў, у тым, каб актыўнымі стваральнікамі свайго прафесійнага выдання былі найперш самі настаўнікі, якія рэалізуюць на практыцы адукацыйныя праграмы па беларускай мове і літаратуры. У звароце да педагогаў у першым нумары часопіса галоўны рэдактар В. У. Протчанка пісаў: «Але жаданых мэт можна дасягнуць толькі сумеснымі намаганнямі вучоных, метадыстаў і настаўнікаў, пры цесным супрацоўніцтве і садружнасці навукі і практыкі. Вось чаму так важна паслядоўна і сістэматычна абменьвацца думкамі і вопытам па актуальных праблемах выкладання беларускай мовы і літаратуры ва ўсіх тыпах навучальных устаноў. Гэта асноўная мэта і магістральны напрамак у працы рэдкалегіі часопіса» [10, с. 7].

У 2000-х гг. фармат часопіса не змяніўся, а выпрацаваная канцэпцыя выдання атрымала далейшае развіццё і новыя зместавыя аспекты. Пасля

перыяду рэдактарства В. У. Протчанкі стратэгічны курс заставаўся ранейшы – сувязь тэорыі і практыкі, кансалідацыя намаганняў па інавацыйным развіцці моўнай і літаратурнай адукацыі. Вядучыя вучоныя-метадысты скарыстоўвалі часопіс як друкаваны сродак трансляцыі вынікаў навуковых даследаванняў і ўкаранення ў практыку найноўшых тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да навучання. Яскравае сведчанне таму публікацыя артыкулаў Л. А. Мурынай у суаўтарстве з Г. М. Валочка «Сістэмна-функцыянальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы пры навучанні мовам у школе» (2006, № 10), «Лінгвакультуралагічны падыход пры навучанні мовам у школе» (2006, № 11). Гэтыя артыкулы былі змешчаны ў наваствoранай рубрыцы «Тэорыя і практыка навучання».

У цэнтры ўвагі метадыстаў кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры – фарміраванне новых прафесійных кампетэнцый настаўнікаў, падвышэнне ўзроўню іх майстэрства ў педагагічнай дзейнасці. Найбольш прыкметныя з метадычных публікацый, адрасаваных чытачам часопіса, гэта артыкулы Л. М. Гамеза «Рэалізацыя камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў працэсе ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў» (2007, № 6), «Комплексная методыка ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні словаўтварэння» (2008, № 6), В. У. Праскаловіч «Рэалізацыя асобасна арыентаванага падыходу ў працэсе вывучэння твораў І. Навуменкі» (2008, № 6) і інш. Напісанне артыкулаў прадыктавана неабходнасцю забеспячэння педагогаў якаснымі практычнымі матэрыяламі, распрацаванымі на аснове інавацыйных падыходаў, методык, тэхналогій. У гэтай сувязі несумненную метадычную каштоўнасць маюць артыкулы І. Э. Саўко, У. П. Саўко «Вывучэнне тэмы “Асноўныя патрабаванні да маўлення”» (1999, № 1), І. У. Таяноўскай, П. В. Грынчанка «Навучанне прыёмам фармулявання назвы навукова-папулярнага даклада (X клас)» (2003, № 5), Н. Б. Рашэтнікавай «Маральнае выхаванне асобы на прыкладзе рамана І. Навуменкі “Сасна пры дарозе”» (2008, № 6) і інш.

Часопіс за больш як два з паловай дзесяцігоддзі стаў асобнай і эфектыўнай пляцоўкай для прэзентацыі навуковага плёну і творчага патэнцыялу педагогаў, а галоўнае, як і жадалася першаму галоўнаму рэдактару, прафесійнай трыбунай для прафесійнага дыялогу, абмену думкамі і вопытам. У 2008 г. рэдкалегіяй часопіса быў арганізаваны круглы стол «Адукацыйныя тэхналогіі ў сучаснай школе: тэорыя, практыка, праблемы», матэрыялы якога друкаваліся з рэгулярнай перыядычнасцю і мелі розгалас, сведчаннем чаму шматлікія адсылкі настаўнікаў да гэтых матэрыялаў. Удзельнікі дыскусійнага круглага стала абмяркоўвалі стан і перспектывы адукацыі, разважалі пра тое, якім быць уроку беларускай

мовы і літаратуры, уздымалі актуальныя метадычныя праблемы. Так, Н. Б. Рашэтнікава выказалася на тэму «Фарміраванне чытацкіх уменняў як метадычная праблема» (2009, № 8). Нароўні з вядомымі даследчыкамі і метадыстамі В. Я. Ляшук, Т. І. Шамякінай, А. В. Руцкай, М. Г. Яленскім, Г. М. Валочка і іншымі аўтарамі на старонках часопіса выступаюць вопытныя настаўнікі-метадысты, настаўнікі-практыкі. Рэдкалегія часопіса ініцыявала правядзенне круглага стала «Беларуская мова і літаратура: актуальныя пытанні навучання і выхавання», які ў сувязі з пагаршэннем эпідэміялагічнай сітуацыі адбыўся ў завочным фармаце, яго матэрыялы надрукаваны ў 2020–2021 гг. Сярод аўтараў публікацый – настаўнікі-выпускнікі філфака БДУ. Яны, грунтуючыся на ўласным метадычным вопыце, вылучаюць найбольш важныя і эфектыўныя, у тым ліку інавацыйна-тэхналагічныя, складнікі адукацыйнай практыкі, пазначаюць кірункі і шляхі інтэнсіфікацыі навучання. Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры можа ганарыцца сваімі былымі студэнтамі, творчымі педагогамі. Публікатарскі плён на старонках часопіса «Беларуская мова і літаратура» дзясяткаў выпускнікоў красамоўна засведчыў пра існаванне і годнае самасцвярджэнне метадычнай школы філалагічнага факультэта БДУ, да якой належаць вядомыя педагогі-практыкі і сталыя аўтары А. М. Якімовіч, А. К. Пекач, І. Ч. Босы, І. Г. Згрундо, С. І. Літвінчык, Н. Д. Ламака, Т. І. Мойса, Ю. Ю. Атрошчанка і інш.

Дзякуючы супольным намаганням аўтараў двух часопісаў «Роднае слова» і «Беларуская мова і літаратура» на сёння створаны вялікі фонд ці банк навукова-філалагічнай, педагагічнай, метадычнай, беларусазнаўчай інфармацыі. У гэтым напрацаваным багацці ёсць і часцінкі творчай працы выкладчыкаў філфака В. П. Краснея, І. К. Германовіча, М. Р. Прыгодзіча, І. Э. Ратнікавай, Т. І. Шамякінай, Е. А. Лявонавай, С. М. Якуба, В. Ю. Дылеўскай, У. Г. Кароткага, А. Л. Вераб'я, М. В. Супрунчука і інш. Гэты разнастайны матэрыял будзе і надалей карысны пры арганізацыі працэсу навучання, для самападрыхтоўкі, прафесійнай дзейнасці педагогаў.

Старонкі часопіса «Беларуская мова і літаратура» ад самага пачатку прыцягвалі-вабілі маладых даследчыкаў. Свае артыкулы па тэмах кандыдацкіх дысертацый тут надрукаваў цэлы шэраг кандыдатаў педагагічных навук: А. І. Белая, Т. І. Мароз, В. Я. Шкілёнак, Т. М. Пучынская, В. У. Зелянко, С. В. Мартынкевіч і інш. Невыпадкова была запачаткавана і праіснавала дастаткова працяглы час часопісная рубрыка «Галасы маладых». Часопіс, друкуючы матэрыялы аспірантаў і маладых выкладчыкаў, тым самым даваў і дае магчымасць аўтарам раскрыць індывідуальны інтэлектуальна-творчы патэнцыял, дапамагае ў шырокай апрабацыі

канцэптуальных палажэнняў і вынікаў даследаванняў, у практыка арыентаванай падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Адна з ранніх навуковых і першыя педагагічныя публікацыі былога метадыста Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а на цяперашні момант загадчыка кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры БДУ А. А. Акушэвіча надрукаваны на старонках часопіса «Беларуская мова і літаратура» («Выслоўе Францыска Скарыны “Понеже…”: структура, рэцэпцыя», 2015, № 9; «Удасканаленне педагагічнага майстэрства настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў сістэме павышэння кваліфікацыі», 2018, № 6; «Некаторыя аспекты метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, 2019, № 9 і інш.). Андрэй Аляксандравіч супрацоўнічаў з часопісам і з боку Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, і па лініі Міністэрства адукацыі.

Яшчэ адзін інтэлектуальна-творчы прадукт філолагаў і метадыстаў заслугоўвае ўвагі – навукова-метадычны зборнік «Філалагічная адукацыя». Пабачылі свет тры выпускі гэтага спецыялізаванага выдання. Задумвалася, што на яго аснове ў перспектыве паўстане перыядычны часопіс, арыентаваны на тэорыю і практыку навучання, выкладання філалагічных дысцыплін у вышэйшай школе. Гэта ніша заставалася практычна свабоднай, яшчэ належным чынам не асвоенай, паколькі ў парадыгме ўніверсітэцкай філалагічнай адукацыі з пункту гледжання яе навукова-метадычнага забеспячэння і практыкі навучання мусіць быць асобнае педагагічнае выданне. Ідэю рэалізацыі новага інфармацыйна-метадычнага праекта падтрымалі Л. М. Гамеза, В. У. Праскаловіч, І. У. Таяноўская, якія ўвайшлі ў рэдкалегію «Філалагічнай адукацыі». Выкладчыкі кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры сталі аўтарамі зборніка, спрычыніліся да фарміравання яго актуальнага і праблемнага зместавага поля з вылучэннем найноўшых трэндаў і інавацый у трансфармацыі адукацыі на сучасным этапе. Назвы аўтарскіх публікацый красамоўна гавораць самі за сябе: «Тэхналогія дыстанцыйнага навучання: міф або рэальнасць?» (2009, вып. 1), «Інавацыйная адукацыйная прастора філолага: рэаліі і перспектывы» (2019, вып. 3) В. У. Праскаловіч, «Удасканаленне зместу курса методыкі выкладання моў з дапамогай камп’ютарных тэхналогій» (2009, вып. 1) І. Э. Саўко, У. П. Саўко, «Навучанне літаратуры: тэхналогіі, асновы інтэграцыі, кантэкст (да праблемы прафесійнай падрыхтоўкі студэнта-філолага» (2011, вып. 2) В. Ю. Дылеўскай.

Кафедра як навукова-педагагічная структура моцная і прэзентабельная сваімі творчымі дасягненнямі і набыткамі, якія складаюць яе прафесійны, топавы імідж, які немагчымы без інфармацыйнай складовай, публікатарскіх і іншых рэйтынгавых паказальнікаў. Ёсць усе падставы

меркаваць і спадзявацца, што кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры і надалей застанецца ключавой структураўтваральнай адзінкай у сістэме ўніверсітэцкай філалагічнай і гуманітарнай адукацыі і ў метасістэме нацыянальнай адукацыі, будзе паспяховым лідарам у рэалізацыі сучасных педагагічных стратэгій і метадычных інавацый.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Міцкевіч К.* Методыка роднае мовы. Мінск : Дзяржвыд Беларусі, 1926.
2. *Замоцін І. І.* Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні: метадыч. нарысы. Мінск : Дзяржвыд Беларусі, 1927. Вып. 1.
3. *Замоцін І. І.* Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні: метадыч. нарысы. Мінск : Дзяржвыд Беларусі, 1928. Вып. 2.
4. *Лазарук М. А.* Навучанне і выхаванне творчасцю: пед. роздумы і пошукі. Мінск : Нар. асвета, 1994.
5. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2001.
6. *Бельскі А. І.* Прафесар В. У. Протчанка – вучоны-дыдакт і рэдактар // Беларус. мова і літ. 2020. № 12. С. 5–6.
7. Окрыленные словом: к 80-летию филологического факультета БГУ / ред. совет: И. С. Ровдо (предс.) [и др.]. Минск : БГУ, 2019.
8. *Саматыя І. М., Саматыя Р. І.* Методыка выкладання беларускай мовы З. Б. Вараповіч // Філалагічная адукацыя: навук.-метад. зб. / рэдкал.: А. І. Бельскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2011. Вып. 2. С. 53–57.
9. *Протчанка В. У.* Рэфармаванне адукацыі і мова // Беларус. мова і літ. 1997. № 8. С. 3–12.
10. *Протчанка В. У.* Садружнасць і супрацоўніцтва – умова поспеху // Беларус. мова і літ. 1995. № 1. С. 3–8.